**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

05.07.2016 № 112

г. Мінск

г. Минск

Аб правядзенні Рэспубліканскага конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі “Бела-тон”

На падставе пункта 2 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263 “Об организации и проведении на территории Республики Беларусь фестивалей, конкурсов, форумов, праздников и пленэров, финансируемых из республиканского и (или) местных бюджетов”, абзаца другога падпункта 9.1 пункта 9 Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь фестываляў, конкурсаў, форумаў, святаў і пленэраў, фінансуемых з рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263 “Об организации и проведении на территории Республики Беларусь фестивалей, конкурсов, форумов, праздников и пленэров, финансируемых из республиканского и (или) местных бюджетов”, ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці з 1 верасня па 31 снежня 2016 г. Рэспубліканскі конкурс на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі “Бела-тон”.

2. Зацвердзіць прыкладзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі “Бела-тон”.

3. Кантроль за выкананнем дадзенага загаду ўскласці на першага намесніка Міністра І.У.Дрыгу.

Міністр Б.У.Святлоў

3. 3235.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
05.07.2016 № 112

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі “Бела-тон”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі “Бела-тон” (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

2.1. адраджэння, развіцця, папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў музычнага мастацтва, далучэння да яго шырокіх слаёў грамадства;

2.2. паказу дасягненняў у галіне музычнага мастацтва;

2.3.выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі, павышэння ўзроўню выканальніцкага майстэрства.

3. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Белтэлерадыёкампанія, дзяржаўная тэатральная-відовішчная ўстанова “Маладзёжны тэатр эстрады”, грамадскае аб’яднанне “Беларускі саюз кампазітараў”, грамадскае аб’яднанне “Саюз пісьменнікаў Беларусі” (далей, калі не вызаначана іншае – арганізатары).

4. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 1 верасня па 31 снежня 2016 г.

5. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў газеце “Культура”, іншых друкаваных сродках масавай інфармацыі, на афіцыйных сайтах арганізатараў у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт і павінна ўтрымліваць звесткі аб часе, месцы правядзення конкурсу, умовах конкурсу, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых песен, парадку і тэрмінах аб’яўлення вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

6. У конкурсе могуць прымаць удзел аўтары музыкі і (або) слоў эстрадных песен аб Беларусі на беларускай або рускай мове – грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы

без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (далей – удзельнікі конкурсу).

7. Для ўдзелу ў конкурсе яго ўдзельнікі ў перыяд з 1 верасня да 1 лістапада 2016 г. падаюць на адрас дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Маладзёжны тэатр эстрады» (220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 18 а, тэл. (017) 207 86 11; 213 15 66; e-mail: teatrestrady@mail.ru, афіцыйны сайт: www.estrada.by) заяўку па форме згодна з дадаткам 1 і матэрыялы:

7.1. аудыязапіс песні на CD або flash-card (поўны плюс);

7.2. нотны запіс песні;

7.3. тэкст песні на беларускай або рускай мове.

8. Адзін удзельнік конкурсу можа прадставіць не больш дзвюх песень.

На конкурс прадстаўляюцца песні патрыятычнай накіраванасці працягласцю ад 2,5 да 4 хвілін, прызначаныя для сольнага ці калектыўнага выканання.

Удзельнікі конкурсу гарантуць наяўнасць у іх правоў на музыку і (або) словы песні.

Матэрыялы, прадстаўленыя з парушэннем патрабаванняў дадзенай Інструкцыі або непрыдатныя для праслухоўвання, да разгляду не прымаюцца.

Прадстаўленыя матэрыялы не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.

9. Для непасрэднага кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт, які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў (са згоды іх кіраўнікоў) і зацікаўленых арганізацый, фізічных асоб, якія прымаюць удзел у правядзенні конкурсу. Персанальны склад арганізацыйнага камітэта зацвярджаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

10. Арганізацыйны камітэт:

10.1. ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу, стварае дырэкцыю конкурсу;

10.2. уносіць на разгляд Міністэрства культуры прапановы па каштарысу выдаткаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу;

10.3. разглядае і зацвярджае:

спіс удзельнікаў конкурсу;

план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні конкурсу;

сімволіку конкурсу, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку;

10.4. ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення конкурсу і яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

10.5. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі конкурсу;

10.6. вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

11. Конкурс праводзіцца ў два этапы.

Першы этап з'яўляецца адборачным. На першым этапе па выніках разгляду заявак вылучаюцца песні для ўдзелу ў другім этапе конкурсу.

Для вылучэння для ўдзелу ў другім этапе конкурсу фарміруецца адборачная камісія з ліку кампазітараў, паэтаў, мастацтвазнаўцаў, музычных крытыкаў і іншых, творчых работнікаў, прадстаўнікоў арганізатараў і іншых зацікаўленых арганізацый.

Персанальныя склады адборачных камісій зацвярджаюцца арганізацыйным камітэтам.

12. На першым этапе адборачная камісія разглядае прадстаўленыя на конкурс песні, ажыццяўляе фарміраванне пераліку песень, якія вылучаны для ўдзелу ў другім этапе конкурсу, і перадае яго ў журы конкурсу.

Пры неабходнасці адборачная камісія мае права запатрабаваць дадатковыя звесткі аб удзельніках конкурсу.

Пасяджэнне адборачнай камісіі лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за дзве трэці членаў камісіі. Рашэнні адборачнай камісіі прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў членаў камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня адборачнай камісіі.

13. Другі этап конкурсу з'уляецца заключным, на ім разглядаюцца песні, адабраныя адборачнай камісіяй на першым этапе, падводзяцца вынікі конкурсу.

Па выніках правядзення другога этапу вызначаюцца пераможцы конкурсу. Ацэнку прадстаўленых песень і выбар пераможцаў ажыццяўляе журы конкурсу ў перыяд, устаноўлены аргкамітэтам.

Персанальны склад журы зацвярджаецца арганізацыйным камітэтам.

Склад журы фарміруецца з ліку творчых работнікаў, кампазітараў, мастацтвазнаўцаў, эстрадных выканаўцаў, іншых работнікаў культуры, дзеячаў культуры і мастацтва, прадстаўнікоў арганізатараў і іншых зацікаўленых арганізацый.

У склад журы не маюць права ўваходзіць асобы, якія з'яўляюцца аўтарамі музыкі і (або) словаў песень, заяўленых да ўдзелу ў конкурсе.

Пасяджэнне журы з'яўляецца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за дзве трэці членаў журы.

14. Ацэнка песень і вызначэнне пераможцаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з наступнымі крытэрыямі:

14.1. музыка:

меладычная выразнасць;

лёгкасць выканання і запамінання;

адпаведнасць характару і вобразнаму зместу тэкста.

14.2. словы:

патрыятычны змест;

наяўнасць не менш чым двух куплетаў і прыпеву;

высокі літаратурны ўзровень, захаванне прыкмет паэтычнага твора (рытм, рыфма, памер);

выкарыстанне сучаснай беларускай або рускай літаратурнай мовы;

лёгкасць вымаўлення і запамінання.

15. Пераможцы конкурсу вызначаюцца шляхам галасавання (па рашэнні журы – адкрытым ці тайным) простай большасцю галасоў членаў журы, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку, калі дзве ці больш песні набіраюць аднолькавую колькасць галасоў, пераможцам прызнаецца ўдзельнік конкурсу, за якога аддаў голас старшыня журы.

Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар журы, лічыцца канчатковым, перагляду не падлягае і абнародваецца на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў.

16. Пераможцам конкурсу ўручаецца спецыяльны дыплом конкурсу і ўстанаўліваецца грашовая прэмія ў памерах:

16.1. першае месца:

аўтар музыкі – 80 базавых велічынь;

аўтар слоў – 80 базавых велічынь;

16.2. другое месца

аўтар музыкі – 60 базавых велічынь;

аўтар слоў – 60 базавых велічынь;

16.3. трэцяе месца

аўтар музыкі – 50 базавых велічынь;

аўтар слоў – 50 базавых велічынь.

17. У выпадку, калі аўтар музыкі з'яўляецца і аўтарам слоў, прэмія суміруецца (за музыку і за словы).

У выпадку, калі аўтараў музыкі, або аўтараў слоў некалькі, грашовая прэмія падзяляецца на роўныя часткі паміж пераможцамі.

Пры вылічэнні памеру грашовай прэміі прымаецца памер базавай велічыні, установлены на дзень прыняцця рашэння журы Грашовая

прэмія пералічваецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь на банкаўскі рахунак удзельнікаў конкурсу, якія сталі пераможцамі.

18. Арганізатары конкурсу садзейнічаюць уключэнню песень – пераможцаў у праграмы культурна-відовішчных мерапрыемстваў, іх ратацыі ў тэлевізійным і радыёэфіры.

19. Інфармацыя аб выніках конкурсу ў 7-дзённы тэрмін з моманту правядзення пасяджэння журы і вызначэння пераможцаў змяшчаецца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (http://www.kultura.by/) і Маладзежнага тэатра эстрады (http://www.estrada.by/).

20. Фінансаванне арганізацыі і правядзення конкурсу ажыццяўляецца ў межах бюджэтных сродкаў, прадугледжаных Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь на цэнтралізаваныя мерапрыемствы, а таксама за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі "Бела-тон"

Форма

## ЗАЯЎКА
на ўдзел у Рэспубліканскім конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі "Бела-тон"

<table>
<tr><td colspan="2">Прозвішча</td><td>Вобласць, горад</td></tr>
<tr><td colspan="2">Уласнае імя</td><td rowspan="2">Паштовы адрас удзельніка</td></tr>
<tr><td colspan="2" rowspan="2">Імя па бацьку (калі такое маецца)</td></tr>
<tr><td>Месца працы (вучобы)</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Дзень, месяц і год нараджэння</td><td rowspan="2">Поўных гадоў</td><td>Тэл.</td></tr>
<tr><td>Факс</td></tr>
<tr><td colspan="2">Дакумент, які сведчыць асобу<br>Серыя №<br><br>Кім і калі выдадзены</td><td>E-mail</td></tr>
<tr><td colspan="3"></td></tr>
<tr><td colspan="3">Назва песні</td></tr>
<tr><td colspan="2">Кампазітар</td><td>Час гучання</td></tr>
<tr><td colspan="2">Аранжыроўшчык</td><td></td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
| Аўтар слоў | |
| З Інструкцыяй аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на лепшую сучасную эстрадную песню аб Беларусі "Бела-тон" азнаёмлены (на)<br>________________________________<br>( подпіс удзельніка конкурсу) | |

У выпадку выхаду дадзенай песні ў другі этап конкурсу абавязваюся прадаставіць дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установе "Маладзёжны тэатр эстрады" правы на выкарыстанне музыкі і (або) слоў названай песні шляхам заключэння адпаведнага дагавору.

____________________ (подпіс) ____________ (дата) __________________ (ініцыялы, прозвішча)